УДК 81

# МАТЫВАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ВЫКЛАДЧЫКА НА ЗАНЯТКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

В.В. ПАНЕЖА, Л.А. КАЗЛОЎСКАЯ
Дзяржаўная ўстанова вышэйшай прафесійнай адукацыі
«БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ»
Магілёў, Беларусь

Праблема развіцця маўлення вучняў, студэнтаў набывае ў наш час усё большае грамадскае значэнне, таму што маўленне з’яўляецца важным паказчыкам духоўнай культуры асобы. Грамадству неабходны людзі, якія валодаюць словам, умеюць абараніць свае перакананні, погляды, творча ўключыцца ў працэс міжасобаснай камунікацыі. На жаль, фарміраванню маўленчай культуры навучэнцаў мала садзейнічае працэс тэхнізацыі і пасіўнае пазнанне праз сродкі масавай інфармацыі. У гэтым плане мова і літаратура як вучэбныя дысцыпліны ствараюць найспрыяльнейшыя ўмовы для развіцця і ўдасканалення маўлення.

Добра вядома ісціна, што чалавека немагчыма чаму-небудзь навучыць, калі ён сам не будзе вучыцца, калі не аvalодае ўменнямі самастойна здабываць веды. Гэтыя ўменні адыгрываюць важную ролю ў развіцці асобы, бо такое развіццё не часовае, яно адбываецца на працягу ўсяго жыцця. Паступова чалавек усведамляе, што важны не аб’ём ведаў, якімі ён валодае, а яго ўменне іх атрымліваць, выкарыстоўваць у канкрэтных жыццёвых сітуацыях.

Зыходзячы з канцэпцыі літаратурнай і моўнай адукацыі, пры правядзенні заняткаў неабходна кіравацца двума асноўнымі прынцыпамі: аперацыйным і матывацыйным. Аперацыйны прынцып прадугледжвае, што ў ходзе навучання роднай мове да яе неабходна адносіцца як да “прадмета прадметаў”, сродку авалодвання новымі ведамі па іншых вучэбных дысцыплінах. Матывацыйны прынцып азначае, што пры падрыхтоўцы выкладчыкам, або настаўнікам да заняткаў варта накіроўваць навучальную дзейнасць на дасягненне канкрэтных мэт. Для рэалізацыі гэтых мэт вельмі важна сфарміраваць у вучняў, студэнтаў выразна акрэсленыя матывы, патрэбнасці іх дзейнасці. Асноўнымі матывамі любой дзейнасці з’яўляюцца: патрэбнасці і інтарэсы; матывы, якія непасрэдна пабуджаюць; матывы, якія пабуджаюць перспектыўна; адмоўныя матывы. Вызначаецца два тыпы матывацыі: знешняя і ўнутраная. Безумоўна, паспяховай з’яўляецца тая матывацыя, якая заахвочвае навучэнцаў да адпаведнай дзейнасці з мэтай свядомага пашырэння і паглыблення сваіх ведаў, павышэння свайго культурнага ўзроўню. Фарміраванне матываў да вучобы – гэта, у першую чаргу, стварэнне на занятках умоў для праяўлення ўнутраных імкненняў навучэнцаў да навучэння. Унутраная матывацыя, незалежна ад знешніх фактараў, з’яўляецца важнай умовай паспяховай вучобы.